Напалеона і адначасова пераўтварылася ў арэну жорсткіх баявых дзеянняў і марадзёрства. Сувязі ў пазнейшы час найбольш яскрава ўвасобіліся ў эміграцыі ў Францыю нашых суайчыннікаў, якія ў французскім справаводстве часцей за ўсё занатоўваліся палякамі (“des réfugiés polonais”). У дэпартаментальных архівах Францыі знаходзіцца багата дасье аб эмігрантах з беларускіх губерняў Расійскай імперыі, пераважна інсургентаў па паўстаннях 1830-1831 і 1863-1863 гг. Яны ўтрымліваюць досыць шмат біяграфічных звестак, важных для вывучэння фарміравання беларускай дыяспары ў Францыі. Згадкі беларускага кантэксту ў дакументах канца XIX – першай траціны XX ст. досыць рэдкія. Яны прадстаўленыя пераважна эканамічнымі праектамі, дзейнасцю каталіцкіх манаскіх ардэноў, справамі аб ваенных стратах і палонных часу Першай сусветнай вайны.

На васьмістах старонках даведніка можна адшукаць дакументы ў французскіх архівах са згадкамі як Літвы (дакладней, Вялікага Княства Літоўскага), так і шматлікіх беларускіх гарадоў і мястэчак: Беластоку, Быцені, Вільні, Горадні, Косава, Кобрыну, Менску, Мсціслава, Магілёву, Нясвіжу, Полацку і інш. [3, с. 791, 793–805]. Безумоўна, гэта толькі вельмі павярхоўны і прыблізны падыход, які дазваляе скласці самае агульнае ўяўленне аб наяўнасці цікавых беларускаму гісторыку дакументаў у французскіх архівах рознага ўзроўню і падпарадкавання. У перспектыве неабходна падымаць пытанне аб рэалізацыі праекту “Гістарычныя крыніцы аб Беларусі і беларусах у французскіх архівах”. Пры гэтым, час з’яўляецца нашым хаўруснікам, бо апошнія дзесяцігоддзі французскія архівы зрабілі велізарны крок у бок імклівай алічбоўкі і навуковай апрацоўкі зместу дакументаў. Большасць значных архіваў, за выключэннем архіваў падкантрольных Міністэрству абароны Францыі і Міністэрству замежных спарваў, ужо стварылі і зрабілі публічнымі надзвычай шмат раней недасяжных гістарычных дадзеных беларускацэнтрычнага зместу.


1. Beaucour, F. L’apport des archives françaises à l’histoire du Belarus-Biélorussie / F. Beaucour. – Levallois : Centre d’études napoléoniennes, 2000. – 8 f.
2. Lalkoù, I. Aperçu de l’histoire politique du Grand-duché de Lithuanie / I. Lalkoù ; préfacé par B. Drweski. – Paris : l’Harmattan, 2000. – 125 p.
3. Les sources de l’histoire de la Pologne et des Polonais dans les archives françaises / Direction des Archives de France. – Paris : Direction des Archives de France, 2003. – 814 p.
4. Калько, В. Н. Феномен белорусоведения во Франции в XX – начале XXI вв. в отечественной и французской историографической традиции / В. Н. Калько // Вестн. Полесского гос. университета. Сер. обществ. и гуманитар. наук. – 2013. – № 1. – С. 9–14.
5. Лялькоў, І. Рукапісныя крыніцы Нацыянальнае бібліятэкі Францыі па гісторыі зносінаў паміж Францыяй і Вялікім княствам Літоўскім у Новы час (XVI–XVIII стагодзьдзі) / І. Лялькоў ; прадм. А. Дзярновіча // Athenaeum. – Менск, 1998. – 90 с.
6. Сцебурака, А. М. Падзеі вайны 1812 г. у Беларусі ў святле французскіх дакументаў Дзяржаўнага Імператарскага сакратарыята: чаканні і рэчаіснасць / А. М. Сцебурака // Беларускія архівы на мяжы тысячагоддзяў: здабыткі і страты : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.). – Мінск, 2019. – С. 243–246.



**Дубатоўка М. А.**


## БЕЛАРУСКІЯ АРХІВЫ Ў 1812 ГОДЗЕ: СТРАТЫ І ПЕРАМЯШЧЭННІ

На працягу стагоддзяў у беларускіх гарадах назапашваліся багатыя архіўныя калекцыі, што змяшчалі найкаштоўнейшыя дакументы не толькі для айчыннай гісторыі, але і для разумення гісторыі краін Еўропы ўвогуле. Аднак змены дзяржаўных утварэнняў, у склад каторых уваходзілі землі сучаснай Беларусі, і шэраг ваенных падзей нанеслі архівам велізарныя страты. Вайна 1812 года апынулася для беларускіх губерній чарговай разбуральнай навалай. Ахвярамі канфлікту сталі не толькі людзі, цывільныя будынкі, храмы, палацы, бібліятэкі, але і архіўныя зборы. Прытым шмат якія з іх сёння маглі б лічыцца нацыянальнымі здабыткамі. Многія беларускія архівы зазналі розны, але ўсё адно нешчаслівы лёс: некаторыя зніклі назаўжды ў 1812 годзе; некаторыя ж змянілі месца знаходжаня, невысветленае дагэтуль. У дадзеным артыкуле будуць разгледжаныя страты і перамяшчэнні архіваў у Вільні, Смаленску, Нясвіжы, Гродна, Віцебску і Полацку падчас руска-французскай кампаніі 1812 года.

Вывучэннем лёсу беларускіх архіўных збораў у вайне 1812 г. займаліся ў розныя часы айчынныя і замежныя даследчыкі. Сярод даследванняў за часамі Расійскай імперыі вылучаецца артыкул А. В. Журкевіча аб стратах архіўных збораў Смаленска [4], у якім аўтар надае шмат увагі данясенням непасрэдных сведкаў ваенных падзей 1812 года ў горадзе. Сярод найбольш важных сучасных публікацый па гэтай тэме варта прыгадаць працы М. Ф. Шумейкі [14, 15], у якіх прыводзіцца агульная ацэнка стратаў архіўных калекцый падчас вайны. Таксама гэтаму пытанню прысвечаны працы Т. Ю. Афанасьевай [3], Д. У. Карава [6], А. М. Латушкіна [8, 9], М. М. Сачка [11]. Аднак грунтоўнае даследванне стратаў і перамяшчэнняў беларускіх архіваў у 1812 годзе ў сучаснай гістарыяграфіі адсутнічае.




Репозиторий ВГУ

Варта сказаць, што падчас ваенных падзей больш за ўсё пацярпелі архівы невялікіх гарадоў, бо ў іх захаванні царскія ўлады не бачылі сэнсу. Ставілася задача перш-наперш уратаваць архіўныя зборы, што мелі палітычнае і маёмаснае значэнне. Так, у рапарце гарадзенскага губернатара А. Ланскога ад 4 чэрвеня 1812 года адзначалася, што былі прынятыя меры па транспартацыі архіваў з прысутных месцаў Гродна, Берасця і іншых павятовых гарадоў у Вільню. Далей меркавалася перавезці іх у Пскоў [15, с. 47]. Пытанне аб характару дакументаў у архіве Вільні, іх дакладнае месцазнаходжанне падчас і пасля 1812 года мусіць быць даследвана асобна. Аднак вядома, што архіў Полацкага біскупства ў перыяд з 1810 па 1828 гг. знаходзіўся ў Вільні і не пацярпеў падчас руска-французскай кампаніі [2, с. 6].

Напярэдадні вайны 1812 года ў Смаленскім архіве вылучаліся тры асноўныя часткі: губернскі архіў, архіў гарадскога магістрату, архіў праваслаўнай кансісторыі [4, с. 347]. Калі да горада падыйшлі французскія войскі, акупацыйнае камандаванне прыняло рашэнне спаліць гарадскія будынкі, у ліку якіх быў і архіў. Уратаваўся ў вогнішчы вайны толькі кансісторскі архіў [4, с. 345]. Смаленскі губернатар барон К. І. Аш узгадваў, што царскія войскі паспелі вывезці планы, мапы, аднак архіў не паспелі праз банальны недахоп коняў і чалавечых рэсурсаў [4, с. 352]. Хаця зараз Смаленск не ўваходзіць у межы нашай дзяржавы, мы разглядаем архіў з нагоды таго, што па нашэсці Напалеона архівы прысутных месцаў беларускага горада Мсціслаўля (у тым ліку старажытныя дакументы да 1662 г. [7, с. 63]) былі перавезеныя менавіта ў Смаленск як у бяспечнае месца, якое не будзе занятае французамі ніколі. Царскі ўрад засцерагаўся авалодання французамі інфармацыяй аб мясцовасці на тэрыторыі імперыі, якую яны займаюць; гэтым тлумачылася палітыка эвакуацыі архіваў як важных стратэгічных крыніц [11, с. 100]. Дастаўляліся дакументы «в 19 тюках и 6 сундуках при двух рядовых штатной команды, а затем сложены в нижнем этаже корпуса Совестнаго Суда» [4, с. 357–358].

Таксама варта улічыць, што ў XVIII ст. у Смаленск быў перавезены архіў Лідскага замку [5, с. 29]. Падчас паўстання 1794 г. ў сакавіку горад быў канчаткова заняты рускімі войскамі, Лідскі замак разбураны, а старажытны архіў, што захоўваўся ў замку, перавезлі ў Смаленск [13, с. 51]. Трэба сказаць, што ў стане на ранейшы перыяд, XVI-XVII стст., лідскі замак ужо не адыгрываў сваёй першапачатковай абарончай ролі. Там праходзілі павятовыя сеймікі, адбываліся судовыя працэсы, і таму ў замку захоўваліся архівы земскага суда, якія, верагодна, і былі вывезеныя ў Смаленск, а пасля спаленыя [12, с. 33].

Што да лёсу архіва роду Радзівілаў у Нясвіжы і падзей 1812 года, пытанне патрабуе дадатковага і паглыбленага вывучэння. Значныя страты бібліятэка і архіў Радзівілаў панеслі ў 1772 г., а таксама падчас Другой сусветнай вайны, таму гэтыя перыяды ў гісторыі архіву даследваныя лепей; час вайны 1812 года застаўся ў цені ўвагі даследчыкаў [8, с. 103]. Нясвіжскі архіў пры ардынаце Дамініку Радзівілу знаходзіўся не ў лепшым стане. Гэта тлумачылася частымі зменамі прадстаўнікоў князя, якія гэтак жа часта змянялі архіўных службоўцаў.

Часткова архіў замка быў вывезены ў Няборава [15, с. 48], часткова знішчаны акурат на месцы [1, с. 63]. Захаваліся пазнейшыя сведчанні архіварыюсаў Рамуальда Сымановіча і Ануфрыя Ёдкі аб тым, што безліч актаў і папер з архіва падчас вайны 1812 года былі раскіданыя па дзядзінцы і замкавых валах, а ў саміх памяшканнях хадзілі наўпрост па дакументах, якіх было насыпана да пояса [9, с. 51–52]. Салдаты дазвалялі сабе рэзаць пергамент і выкарыстоўваць для рамонту падцяжак. Апрача таго, дакументы архіву замянялі дровы для абагрэву палаца [7, с. 62], а «… другие документы исторической важности похищены разными лицами. Печати, не только украшенные алмазами, но и медные, какие только были и имели приятную наружность, тогда от документов оторваны» [14, с. 160].

Архіў горада Гродна таксама пацярпеў у вайне 1812 года. Перад акупацыяй французскімі вайскамі царскім урадам было прынята рашэнне вывезці архіўныя дакументы. Яны апынуліся ў Маскве і Тамбове. На жаль, назад вярнулася толькі частка, бо некаторыя фонды згарэлі падчас пажара ў Маскве [3, с. 115].

Віцебскі архіў з дакументамі яшчэ часоў Сярэднявечча ў 1812 годзе быў часткова перавезены ў Лугу, часткова (матэрыялы дваранскага сходу) – у Невель. Падчас транспартацыі былі згубленыя гарадскія і земскія кнігі Віцебскага ваяводства за 1718 г. і з 1746 па 1772 гг. [10, с. 7]. У запісцы саветніка Рубцова да віцебскага губернатара падкрэсліваецца, што тая частка архіва, якая ўсё ж захавалася пасля вайны 1812 года, занядбана гніе [7, с. 62]. Полацкі архіў таксама зазнаў страты ў вогнішчы падзей 1812 года. Часткова дакументы эвакуявалі ў Пскоў, а архівы полацкага арцыбіскупства згарэлі [6, с. 8, 19].

Такім чынам, архівы беларускіх гарадоў у 1812 годзе панеслі значныя страты. Некаторыя архіўныя калекцыі былі вывезеныя царскімі ўладамі ў іншыя губерні Расійскай імперыі і не вярталіся назад альбо вярталіся часткова. Некаторыя былі знішчаныя ў вогнішчы французскімі жаўнерамі. Важным застаецца факт, што нават калі нейкую мясцовасць не акупавалі непасрэдна



Репозиторий БГУ

французы, каштоўнейшыя дакументы архіўных збораў ўсё адно пацярпелі ад рук расійскага войска: іх знішчалі на месцы або вывозілі, як паказала пазнейшая гісторыя, без магчымасці вяртання назад. Таму ў межах дадзенага артыкулу даць компексную ацэнку архіўным стратам немагчыма. Пытанне патрабуе вывучэння ў межах не толькі ўсіх пацярпелых гарадскіх архіваў, але таксама архіўных збораў у шляхецкіх сядзібах, кляштарах, храмах розных канфесій. Правядзенне глыбокага аналізу дадзенай тэмы дазволіць скласці поўную карціну страт, нанесеных беларускім архіўным зборам вайной 1812 года.


1. Антонава, Т. Ці стане Нясвіж турыстычнай Мекай? // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 1. – С. 63–67.
2. Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XV–XIX стст. у фондзе «Канцылярыя мітрапаліта грэка-уніяцкіх цэркваў у Расіі» : даведнік / склад.: С. І. Паўловіч, Т. М. Мальцава. – Мінск–Полацк, 1999. – 386 с.
3. Афанасьева, Т. Национальному историческому архиву в Гродно – 65 лет / Т. Афанасьева // Архівы і справаводства. – 2005. – № 1. – С. 115–117.
4. Жиркевич, А. В. Смоленские архивы в 1812 г. / А. В. Жиркевич // Смоленская старина. – Смоленск, 1909. – С. 345–371.
5. Калубовіч, А. Мова ў гісторыі беларускага пісьменства / А. Калубовіч. – Ч. 1. – Мюнхэн–Лёндан, 1974–1975. – 84 с.
6. Караў, Д. Архіўная спадчына Вялікага Княства Літоўскага і беларускія архівы ў канцы XVIII – пачатку XX стст. / Д. Караў // Спадчына. – 1996. – № 1. – С. 3–25.
7. Клепікаў, М. Я. Румянцаўскі гурток і ахова помнікаў гісторыі і культуры Беларусі / М. Я. Клепікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 1. – С. 60–66.
8. Латушкін, А. М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX сагоддзяў / А. М. Латушкін // Архівы і справаводства. – 2007. – № 2. – С. 102–107.
9. Латушкін, А. М. Да гісторыі Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у 1790–1818 гг. / А. М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік. – 2005. – № 6. – С. 46–60.
10. Левко, О. Н. Витебск XIV-XVIII вв. : (Стратиграфия, хронология, социал. -ист. топография и технология пр-в) / науч. ред. В. А. Булкин. – Минск : Наука и техника, 1984. – 120 с.
11. Сачок, М. М. Мартыралог дакументальных помнікаў Гродзенскай губерні (Да гісторыі фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна) XIX-XX стст. / М. М. Сачок // Архівы Беларусі на рубяжы XX–XXI стст.: гісторыя, стан, перспектывы развіцця : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 8–9 лют. 2000 г. – Мінск : БелНДІДАС, 2001. – С. 99–104.
12. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII-XVIII стст. / М. А. Ткачоў. – Минск : Навука і тэхніка, 1978. – 144 с.
13. Шимелевич, М. И. Город Лида и Лидский замок (исторический очерк) / М. И. Шимелевич // Виленский календарь. – Вильно, 1906. – С. 37–57.
14. Шумейко, М. Ф. Война 1812 года и белорусские архивы / М. Ф. Шумейко // Французская рэвалюцыя і лёсы свету : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. гадавіне Фр. рэвалюцыі (1789–1799 гг.), Мінск, 21–22 крас. 1999 г. / рэдкал.: У. С. Кошалеў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ. – 1999. – С. 159–160.
15. Шумейко, М. Ф. Архивоведение Беларуси : учебное пособие для студентов исторических факультетов вузов : в 2 ч. / М. Ф. Шумейко, К. И. Козак, В. Д. Селеменев. – Ч. 1. – Минск : Издательский центр РИВШ. – 1997. – 101 с.



**Карпекін К. Р.**


## АРХІВЫ І БІБЛІЯТЭКІ ПРАВАСЛАЎНЫХ ЦЭРКВАЎ У 1918–1920-Я ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЛЁЗНЕНШЧЫНЫ)

У канцы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі найбольшая частка насельніцтва належала да праваслаўнага веравызнання. Цэрквы знаходзіліся ва ўсіх гарадах і мястэчках, у многіх сельскіх населеных пунктах і з’яўляліся важнымі сацыяльна-культурнымі цэнтрамі. Акрамя іншых функцый праваслаўныя святары займаліся асветніцкай і рэгістрацыйнай дзейнасцю, таму натуральным з’яўляецца ўзнікненне пры храмах архіваў і бібліятэк. Па сённяшні час здараюцца выпадкі знаходжання ў храмах пад час рамонтных работ дагэтуль невядомых метрычных кніг і старадрукаў.

Мэта дадзенага даследавання – прааналізаваць стан архіваў і бібліятэк праваслаўных цэркваў у сацыяльна нестабільны перыяд часу – 1918 – 1920-я гг. (на прыкладзе тэрыторыі сучаснага Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці).

Змена палітычнага ладу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. выклікала трансфармацыю сацыяльнай ролі праваслаўнай царквы, у сувязі з чым пачалася кампанія па перадачы метрычных кніг з храмаў органам мясцовай улады. Заканадаўчай базай дадзенага мерапрыемства стаў дэкрэт УЦВК і СНК РСФСР “Аб грамадзянскім шлюбе, аб дзецях і аб вядзенні кніг актаў стану” ад 18 снежня 1917 г. [1, с. 249]. У даследуемым рэгіёне найбольшая частка царкоўных архіваў была перададзена ў валасныя выканкамы ў 1918 г., прычым значная частка – восенню. Меліся і асобныя выпадкі больш позніх перамяшчэнняў: напрыклад, метрычныя кнігі Нова-Бельскай царквы апынуліся ў валвыканкаме 25 лютага 1919 г. Найбольш раннія кнігі датаваліся 1820-мі гг., а самыя познія – 1918 – 1919 гг. (іншымі словамі, святары рабілі запісы да моманту здачы архіваў). У гэты час з асобных цэркваў у валвыканкамы перадаваліся і іншыя дакументы: у прыватнасці, у 1918 г. такі лёс напаткаў прыхода-расходныя кнігі, царкоўны летапіс і кліравыя ведамасці Дабрамыслінскай царквы [8, арк. 18; 11, арк. 54 адв., 59, 64 – 64 адв., 67, 85, 90 адв.].